# БУДУЧЫНЯ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАВЫ Ў ПРАГНОЗНА-АНАЛІТЫЧНЫМ ДАКЛАДЗЕ МАСКОЎСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ІНСТЫТУТА МІЖНАРОДНЫХ АДНОСІН

***Снапкоўскі У. Е.,*** *Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*e-mail: ulsnap44@inbox.ru*
*пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь*

*Разглядаецца і апісваецца настрой расійскай палітычнай эліты ў дачыненні да інтэграцыі з Беларуссю ў кантэксце аднаго з аналітычных даследаванняў Маскоўскага дзяржаўнага інстытута міжнародных адносін (МДІМА).*

***Ключавыя словы****: Расія; Беларусь; інтэграцыя; аналітыка; палітыка.*

Прыблізна ў жніўні—верасні 2018 г. расійскі Маскоўскі дзяржаўны інстытут міжнародных адносінаў МЗС Расіі (МДІМА) выпусціў манаграфію «Свет у XXI ст.: прагноз развіцця міжнароднага становішча па краінах і рэгіёнах». Зыходныя даныя гэтай працы ўстанавіць не давялося, паколькі хутка пасля размяшчэння яна была знята з сайта Цэнтра ваенна-палітычных даследаванняў Маскоўскага дзяржаўнага інстытута міжнародных адносінаў, дзе была напісана. Беларускай грамадскасці, у тым ліку аўтару, аб гэтай публікацыі стала вядома дзякуючы сайту «Нашай нівы», які адгукнуўся на яе паведамленнем-каментарам «Аналітыка ад МДІМА: Неабходныя крымскі сцэнар для Беларусі і найхутчэйшая замена Лукашэнкі». Для беларускіх чытачоў найбольш цікавым выглядае раздзел 6.1.3 «Беларусь: цярністы шлях да інтэграцыі з Расіяй».У ім безыменны аналітык дае прагноз развіцця Беларусі да 2050 г., у якім мае адбыцца аб'яднанне Расіі і Беларусі. Самая важная і галоўная рэкамендацыя, якую аўтар рае расійскім уладам: як мага хутчэй замяніць дзеючага Прэзідэнта А. Лукашэнку на больш прарасійскага кіраўніка. Прычына незадаволенасці Крамлём цяперашнім Прэзідэнтам палягае ў тым, што маўляў, ён гадуе нацыяналістаў, якія могуць стаць перашкодай да бяскроўнага працэсу анексіі. У сувязі з гэтым прапануецца, што Расія павінна мець план накшталт крымскага ў момант перадачы ўлады ў Беларусі.

Перакажам коратка змест беларускага раздзела, пазбягаючы з прычын паліткарэктнасці вядомых ацэнак сутнасці існуючага палітычнага рэжыму ў краіне. Становішча Беларусі ў перыяд да 2025 г. будзе характарызавацца толькі бачнасцю палітычнай стабільнасці і ўскладненнем эканамічнай сітуацыі. Імкнучыся захаваць уладу, Прэзідэнт А. Лукашэнка будзе тармазіць аб'ектыўныя працэсы інтэграцыі з Расіяй, што акажа негатыўна ўплыў на эканоміку Беларусі і ўзровень жыцця яе грамадзян. Па той жа прычыне ён працягне манеўраванне паміж Расіяй і Захадам, але атрымаць якія-небудзь істотныя фінансавыя ўліванні ў беларускую эканоміку з боку ЕС і ЗША не зможа. У выніку сацыяльна-эканамічная напружанасць у краіне будзе расці, а Прэзідэнт, імкнучыся захаваць незалежнасць ад Расіі, «працягне насаджваць у краіне літвінскі нацыяналізм у процівагу агульнарускаму адзінству». Адначасова А. Лукашэнка будзе «душыць любыя прарасійскія рухі і арганізацыі», што прывядзе да палітычнага вакууму на прарасійскім флангу. І чым даўжэй цяперашні Прэзідэнт будзе заставацца пры ўладзе, тым больш шанцаў на тое, што пасля яго сыходу ў Беларусі адбудзецца паўтор украінскага майдану.

На думку аўтара, момант перадачы ўлады ў Беларусі хутчэй за ўсё наступіць да 2025 г., што будзе найбольш напружаным і небяспечным з пункту гледжання расійскіх інтарэсаў. Расія павіінa быць гатовая да таго, каб перадача ўлады ў Беларусі адбылася як мага раней, «інакш прыход да ўлады прарасійскіх сіл будзе ўсё складаней забяспечыць мірным шляхам». Таму Масква павінна мець адпаведны план дзеянняў кшталту таго, што быў увасоблены ў Крыме ў 2014 г. Толькі пасля перадачы ўлады ў Беларусі прарасійскаму кандыдату пачнецца паглыбленая інтэграцыя Расіі і Беларусі як у рамках ЕАЭС, так і Саюзнай дзяржавы, у выніку чаго да 2050 г. «паўстане пытанне аб далучэнні Беларусі да Расіі».

Афіцыйнай рэакцыі ў Мінску на публікацыю МДІМА не адбылося і яе ў прынцыпе не трэба было чакаць. Што нам стала вядома з неафіцыйных крыніц? Аўтарытэтны незалежны палітычны аглядальнік В. Карбалевіч назваў манаграфію «скандальнай», аўтары якой у прынцыпе выключаюць ў будучыні існаванне незалежнай Беларусі [1]. Разам з ім звернем увагу і на тое, што калі раней алармісцкія сцэнарыі аб перспектывах развіцця нашай краіны друкаваліся ў маргінальных расійскіх СМІ, то цяпер крымскі варыянт з'явіўся ў сур'ёзным навуковым, прагнозна-аналітычным дакладзе вядучага цэнтра міжнародных даследаванняў Расійскай Федэрацыі. Пры гэтым нагадаем, што МДІМА — гэта структурнае падраздзяленне расійскага МЗС і што з гэтай навучальнай і навуковай установай факультэт міжнародных адносін БДУ мае дагавор аб супрацоўніцтве і падтрымлівае, на мой погляд, даволі сталыя адносіны. У некаторых сумесных мерапрыемствах ФМА і МДІМА 5—6-гадовай даўнасці аўтар прымаў удзел. Пасля публікацыі кніга знікла з сайта МДІМА, з аўтарам, які напісаў дзве старонкі тэксту пра Беларусь, спынена супрацоўніцтва, а кіраўніцтва МДІМА паведаміла беларускім уладам, што не падзяляе пункт погляду гэтага эксперта.

На гэтым аднак гісторыя вакол публікацыі даклада не скончылася. Паставім пытанне, ці гэта быў «выпадковы пракол» яго рэдактараў, ці пэўны знак для беларускага кіраўніка і разам з ім (для прыхільнікаў і праціўнікаў незалежнасці Беларусі). Калі гэта была рэдактарская памылка, палічым, што пытанне вырашана. Маўляў, пра маленькую Беларусь забыліся, недаглядзелі, аўтар звольнены, публікацыя знята з сайта, «следства закончана, забудзьце». Аднак ёсць шэраг прычын лічыць публікацыю тэстам на трываласць прыхільнікаў незалежнасці Беларусі. Па-першае, ён адлюстроўвае настроі сучаснага расійскага грамадства і эліты, інфіцыраваных крымскай бацылай. Вуснамі расійскага Прэзідэнта У.Пуціна было заяўлена нядаўна, што расіяне з радасцю пойдуць у рай у выніку ядзернай вайны, тым часам, як жыхароў Захаду чакае ад. Па-другое, усіх беларусаў рыхтуюць да страты незалежнасці, а дзеючага Прэзідэнта — да адмовы ад улады. Сакральнае для маладой беларускай дзяржавы выражэнне (Прэзідэнт Лукашэнка=Рэспубліка Беларусь) будзе такім чынам вырашана. Гэта значыць, што ні асобы дзеючага Прэзідэнта, ні дзяржавы не стане. Па-трэцяе, скажам дзякуй аўтару і рэдактарам манаграфіі за «шчырае слова». Цяпер нам хоць вядома, да чаго трэба рыхтавацца. Беларускія і расійскія ўлады даўно ўбаюківалі грамадства «інтэграцыяй» дзвюх дзяржаў і народаў, хаваючы яе сапраўдныя мэты. Хаця трэба прызнаць, што Масква была тут больш шчырая, калі спачатку Прэзідэнт Б. Ельцын, а потым Прэзідэнт У. Пуцін прапаноўвалі цесную інтэграцыю шляхам уваходжання Беларусі ў склад Расіі. Тады

Прэзідэнт А. Лукашэнка знайшоў, што адказаць. Зараз падобна на тое, што гульня ў інтэграцыю падыходзіць да драматычнай, калі не сказаць больш рэзкага слова, развязкі.

### БІБЛІЯГРАФІЧНЫЯ СПАСЫЛКІ

1. Карбалевич, В. Диверсификация дружбы / В. Карбалевич // Свободные новости плюс. — 2018. — 18 сент. — С. 2.

## ИЗМЕНЕНИЯ В ДИПЛОМАТИЧЕСКОМ СТАТУСЕ ТАЙВАНЯ ПОСЛЕ ВЫБОРОВ 2016 Г.

***Сунь Цзюньфэн***, *Белорусский государственный университет,*
*e-mail: vlad_froltsov@rambler.ru*
*пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь*

*Оцениваются изменения в дипломатическом статусе Тайваня после выборов 2016 г. Отмечается, что число стран, поддерживающих дипломатические отношения с Тайванем, уменьшается, а перспективы сохранения Тайванем дипломатического статуса в значительной мере зависят от состояния отношений между КНР и США.*

***Ключевые слова:*** *Тайвань; Демократическая прогрессивная партия; дипломатические отношения; КНР; США.*

Всеобщие выборы на Тайване состоялись 16 января 2016 г. и привели к третьей в его истории смене политической партии у власти. Выступающая за независимость Тайваня Демократическая прогрессивная партия победила Гоминьдан и получила всю полноту политической власти на Тайване. Эта партия отказывается признавать «Консенсус 1992 г.» и осуществляет негативную политику в отношении материкового Китая, что привело к ухудшению отношений между Тайванем и КНР и возобновлению нового раунда противостояния в дипломатической сфере.

Это выразилось, прежде всего, в отказе целого ряда государств продолжать поддерживать дипломатические отношения с Тайванем и желании установить их с КНР. В результате 21 декабря 2016 г. Тайвань разорвал дипломатические отношения с Сан-Томе и Принсипи, 13 июня 2016 г. — с Панамой, 1 мая 2018 г. — с Доминикой, 24 мая 2018 г. — с Буркина-Фасо, 21 августа 2018 г. — с Сальвадором. Все эти страны установили дипломатические отношения с Китайской Народной Республикой и направили в Пекин своих дипломатических представителей для взаимодействия с КНР в полном объеме. В итоге к осени 2018 г. общее число стран, имеющих дипломатические отношения с Тайванем, сократилось до 17, включая Ватикан, что заметно сузило дипломатическое присутствие тайванского правительства в современном мире.

Вместе с тем, основным направлением его политики по-прежнему остаются отношения с США, которые продолжают поддерживать правительство Тайваня из-за стратегического положения и значения этой территории в Азиатско-Тихоокеанском регионе, хотя у Тайваня и Соединенных Штатов нет официальных дипломатических отношений. Фактически они осуществляются на основе выполнения «Закона о взаимоотношениях с Тайванем» (*Taiwan Relations Act, TRA*) посредством деятельности «Американского института на Тайване» (*American Institute in Taiwan; AIT*). Кроме того, правительство США попыталось политически поддержать Тайвань в ситуации разрыва рядом стран дипломатических